У творчасці і Я. Купалы, і М. Багдановіча спалучаюцца, такім чынам, дзве тэндэнцыі нацыянальнага літаратурнага самавызначэння: адна, якая працягвае ўласна нацыянальныя паэтычныя традыцыі, г. зн. нацыянальна заангажыраваная; другая тэндэнцыя развіваецца ў русле асэнсавання нацыянальнай сутнасці ва універсальных катэгорыях шляхам выяўлення і раскрыцця агульначалавечага зместу вобраза беларуса не ў вузкалакальным, а ў шырокім, сапраўды сусветным плане.

[1] Гл.: Багдановіч М. Поўны зб. тв.: У 3 т. Мн., 1993. Т. 2. С. 287.
[2] Мушынскі М. Навуковая і літаратурна-крытычная спадчына М. Багдановіча. // Багдановіч М. Указ. тв. С. 479.
[3] Багдановіч М. Указ. тв. Т. 3. С. 244.
[4] Нязменная сімпатыя паэта да “высокага”, рафінаванага паэтычнага отылю таксама ўяўляецца ў гэтай сувязі своеасаблівай уцеляснёнай формай красы.
[5] Чабан Т. Космас “Вянка” // Багдановіч М. Указ. тв. Т. 1. С. 508.
[6] Каваленка В. Максім Багдановіч // Нарысы па гісторыі беларуска-рускіх літаратурных сувязей: У 4 кн. Пачатак XX ст. 1900–1917. Мн., 1994. Кн. 2. С. 401.
[7] Там жа. С. 403.
[8] Пыско Н. Творчасць М. Багдановіча ў кантэксце традыцыі “цытатнай” паэтыкі А. Пушкіна і “космасу культуры” рускай паэзіі пачатку XX ст. // Пушкін – Беларуская культура – Сучаснасць. Матэрыялы міжнар. навук. канф., Мінск, 26 – 27 мая 1999 г. Мн., 1999. С. 332.
[9] Багдановіч М. Указ. тв. Мн., 1993. Т. 2. С. 223–224.
[10] Там жа. С. 229.
[11] Там жа.

***Максімовіч Валерый Аляксандравіч*** – кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай літаратуры XX ст. БДУ.

*А.І. БЕЛЬСКІ*

## РЭГІЯНАЛЬНЫ СУБСТРАТ І ЯГО РОЛЯ Ў СТВАРЭННІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА ВОБРАЗА СВЕТУ (на матэрыяле беларускай паэзіі)

Нацыянальны вобраз свету ў яго этнічна-беларускім вымярэнні і вызначэнні – гэта беларуская светабудова, склад і адметнасць прасторавага мыслення народа. Нацыянальны свет у шырокім разуменні – прыроднае асяроддзе (краявіды, раслінны свет, фауна, кліматычныя ўмовы і інш.), этнакультурны змест існавання, звязаны з пэўным уладкаваннем побыту, мовай, духоўнымі традыцыямі нацыі. Разгорнутасць трактоўкі этнасферы таго ці іншага народа якраз найбольш поўна і ўвасабляе паняцце "нацыянальны космас", прапанаванае Г. Гачавым[1] і паспяхова ўведзенае ў беларускі навуковы кантэкст Т. Шамякінай[2].

За апошняе дзесяцігоддзе наша айчыннае літаратуразнаўства і культуралогія зрабілі чарговыя захады ў вызначэнні адметнасці і асэнсаванні нацыянальнай карціны свету, што бачыцца з'явай заканамернай, даволі сімптаматычнай. Без адчування і разумення ўласнага "я" ў вялікай агульначалавечай супольнасці, моўна-культурнай самаідэнтыфікацыі, глыбокай і трывалай нацыянальнай свядомасці немагчыма ўявіць духоўную паўнацэннасць этнасу, самабытнасць народнай душы і духу, і гэта – аксіяматычная ісціна.

Нацыянальны вобраз свету ствараецца не толькі ў этнічнай свядомасці, але і ў мастацкай культуры і літаратуры пэўнага народа. Цікавае назіранне ў гэтай сувязі робіць Г. Гачаў, які піша, што паэзія "непасрэдна пераліваe прыроду ў слова. Яна слухае: ёй космас падказвае, прырода намаўляе – і адразу нараджаецца слова, настроенае ва унісон, і хоць духоўна, але змяшчае ў сабе лад жыцця"[3]. Літаратура і, у прыватнасці, паэзія глыбока матэрыялізуе ў сабе нацыянальны погляд на прыроду і рэчаіснасць, найбольш ярка выяўляе склад беларускага светаадлюстравання, а класічныя творы наогул у многім прадвызначаюць адчуванне чалавекам прасторавай



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

культуры свайго этнасу. Мастацкая творчасць як крыніца разумення і вывучэння нацыянальнага менталітэту і нацыянальнага светаўладкавання мае несумненную значнасць і каштоўнасць, на што неаднойчы звярталі ўвагу знаўцы этнапсіхалогіі і этналінгвістыкі[4]. А тое, што літаратурны матэрыял – важны сродак для характарыстыкі беларускай этнічнай свядомасці, нацыянальнага вобраза прыроды і свету ўвогуле, красамоўна засведчылі такія працы канца 80–90-х гг., як артыкулы Т. Шамякінай "Краявіды і літаратура " (1989), "Якуб Колас – пясняр стыхіяў" (1991), манаграфіі А. Бяляцкага "Літаратура і нацыя" (1991), І. Чароты "Пошук спрадвечнай існасці" (1995), Л. Гараніна "Нацыянальная ідэя ў беларускай літаратуры пачатку XX ст." (1996) і інш. Пры высвятленні самабытнасці і шматаблічнасці этнічнага асяроддзя беларусаў, вызначэнні сістэмы каардынат нацыянальнага свету важна ўлічваць і рэгіянальны, або, інакш кажучы, мясцовы фактар. Гэты надзвычай істотны момант у пабудове нацыянальнай мадэлі свету вымагае грунтоўнага і ўсебаковага асэнсавання.

Рэгіянальны субстрат (асаблівасці ландшафту, прыроды, побыту, мовы, тапанімікі, этнаграфічны каларыт) у значнай ступені з'яўляецца перадумовай фарміравання погляду на свет. Наўрад ці хто-небудзь з майстроў слова перш за ўсё імкнуўся стварыць тыпова-нацыянальны вобраз беларускага краю, малюючы нейкія абстрактныя краявіды, ігнаруючы той эмацыянальна-духоўны вопыт, што звязвае яго з родным кутом, так званай малой радзімай. Славуты рускі мастак І. Шышкін зазначаў, што пейзаж павінен быць не толькі нацыянальным, але і мясцовым. Асяроддзе, якое нарадзіла творцу, становіцца сферай яго этнічнай прыналежнасці, вытокам фарміравання нацыянальнай душы і ментальнасці. Ю. Брамлей, аўтар манаграфіі "Этнас і этнаграфія" (1973), заўважае, што "ландшафты этнічнай тэрыторыі замацоўваюцца ў свядомасці яе насельнікаў у выглядзе ўяўленняў пра "родную зямлю""[5]. Трывалая знітаванасць з бацькоўскім кутком зямлі – важнейшая духоўная аснова беларускай паэзіі. Слушна піша І. Навуменка, што "кожны паэт спявае аб зямлі, якая яго нарадзіла..."[6]. Толькі з улікам прыродна-рэгіянальнай структуры светабудовы можна ўбачыць універсальны нацыянальны "партрэт" беларускага краю, выявіць яго шматграннае аблічча.

Рэгіянальны субстрат даволі прыкметна характарызуе змест і аблічча паэтычнага светаадлюстравання. Даследчык М. Грынчык адзначае, што "ў лірыцы, як найбольш лаканічнай і скандэнсаванай форме паэтычнага выяўлення, рэгіянальныя элементы могуць выступаць даволі выразна (у характары асацыятыўнай вобразнасці, сістэме метафорыкі і сінанімікі)..."[7]. Рэгіянальнае – не значыць толькі нешта спецыфічна-мясцовае, вузкаканкрэтнае, што не звязана са складам беларускай этнапрасторы, сістэмай яе асноўных топасаў.

У нацыянальна-мастацкай свядомасці рэгіянальны мікрасвет – найперш пейзажны вобраз радзімы, выяўленне яе красы і непаўторнасці. Паэзія Я. Коласа асабліва красамоўна пераконвае ў гэтым, бо ў ёй у многіх выпадках мы сустракаем апазнавальныя рэаліі і знакі беларускага Панямоння. "Многа слаўненькіх куточкаў // Ёсць у нашым краі..." – гаворыць паэт, які стварыў шматлікія малюнкі і карціны родных мясцін. Тыповы рэгіянальны вобраз свету намаляваны мастаком слова, напрыклад, у вершы "Высокі Бераг". Тут апаэтызаваны "пясчаны скат", "хвоек нізкіх гурт пахілы", "лес, што... высока ўзняў свае камлі", "Неман срэбраводны", "гоман лазнякоў"[8]. Своеасаблівасць ландшафту, прыродна-рэгіянальны каларыт панямонскага краю паэт раскрыў даволі яскрава і шырокаахопна (паэма "Новая зямля", вершы "Наш родны край", "Родныя вобразы", "Роднае поле" і інш.). Колас не быў бы Коласам-мастаком, каб пэўны куточак прыроды ці рэгіянальны пейзаж не набылі ў яго выяўленні максімальна аб'ектызаваны пачуццёвы змест, абагульняльны сэнс. Неман вырастае ў яго мастацкай свядомасці да этнічнага сімвала Беларусі. Разам з тым у паэзіі Я. Коласа знайшоў адлюс-



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

траванне свет беларускага Палесся. З вершаў "Палескія вобразы", "Палессе" і некаторых іншых перад намі паўстае адрозная прыродная стыхія, разнастайныя ўмовы побыту беларуса, пры гэтым дамінантную ролю тут адыгрываюць своеасаблівыя вобразы і рэаліі ландшафту. Калі ў панямонскіх малюнках пейзажны позірк паэта фіксуе "ўзгорачкі роднага поля, рэчкі, курганы, лясы", "поле пясчанае... між гор і лясоў", крывую дарогу "між спелага жыта", "хмызнякі, каменне", "дуб разложысты" і каля яго Нёман са "срэбрам-стужкаю", то палеская рэчаіснасць вымалёўваецца іншай – гэта "балот краіна", "гмах шырокі балот": "Цёмны бор. кусты, балоты, // Кучы лоз і дубняку, // Рэчкі, купіны, чароты, // Мора траў і хмызняку" ("Палескія вобразы"). Значыць, для пэўнага беларускага рэгіёну ўласцівы свае найбольш характэрныя вобразныя знакі свету, што, безумоўна, ускладняе вылучэнне шэрага топасаў у якасці галоўных этнічных сімвалаў. Я. Колас стварыў поліфанічную, шырокапанарамную карціну нацыянальнага свету, прычым рэгіянальны панямонскі кампанент зрабіўся ў яго творчасці неад'емнай асновай выяўлення духоўнай повязі з "вобразамі мілымі роднага краю". Бацькоўскі кут стаўся для паэта асяроддзем вялікага і багатага этнакультурнага зместу жыцця беларуса сярод прыроды.

Нацыянальны космас у паэзіі М. Танка таксама вырастае з рэгіянальных каранёў – прыроды нарачанскага краю, мясцовай этнаграфічна-побытавай рэчаіснасці, тапанімікі, гідронімаў, народнай мовы і фальклору свайго роднага кутка. Яшчэ ў прадмове да першага зборніка паэта "На этапах" (1936) Р. Баравы (Р. Шырма) адзначаў, што Нарач – тая крыніца, "адкуль выцякае багатая лірыка Максіма Танка. Яго мастацкая муза зарадзілася ў звонкім шуме медна-сасновага наднарачанскага бору. Чорныя скібы палёў, пеністыя хвалі Нарачы і Мястра, а пазней шырокія этапныя дарогі былі яе калыскай"[9]. Сам М. Танк у вершы "На шалях азёр" прызнаецца, што яго сэрца і песні шмат разоў узважваліся на шалях Мястра і Нарачы. Пачынаючы ад першай кнігі і да апошняй – "Errata" (1996), у яго паэзіі асноватворнае месца належыць вобразам і пейзажам радзімы (Нарач, родная вёска Пількаўшчына, нарачанскія сосны, бары, валуны, "аблокі над страхой буслінай", "палявая дарога, закалыханая жытам" і інш.), тут шырока выяўляецца этнаграфічна-бытавы каларыт беларускага свету ("напеваў родных пералівы", пчаліны звон і кляпанне кос, ворыва і сяўба, "канцэрт у сене" на нарачанскай сенажаці і інш.). Па сутнасці, у М. Танка пейзажныя вобразы і рэаліі наднарачанскага рэгіёну сталі характарыстычнымі стэрэатыпамі і ўтваральнымі элементамі нацыянальнай карціны свету, яе прасторавай сістэмы каардынат.

Беларускі вобраз свету ў многіх сваіх этнагеаграфічных рысах, тыповых праявах, элементах і сімвалах знаходзіць яркае мастацкае адлюстраванне ў творчасці Р. Барадуліна. Аднак – падкрэслім зноў – рэгіянальны свет з яго рэальна-прадметнай канкрэтыкай у гэтага паэта таксама набывае духоўна-эстэтычную першакаштоўнасць і раскрывае адметнасць этнакультурнай спадчыны народа. Уяўленне пра нацыянальную карціну свету, структурна-вобразны склад беларускага космасу знаходзіць красамоўнае ўвасабленне ў барадулінскім вершы "У адкрытым космасе" са зборніка "Самота паломніцтва" (1990). Вобраз маці ў паэтычным адлюстраванні аўтара – цэнтр нацыянальнага свету, які ў той жа час паўстае як этнічна-рэальнае асяроддзе бытавання:

Мама.
Колькі жыла,
Выходзіла ў космас
Цемры, святла,
У космас адкрыты,
Дзе чакалі
Даёнкі, матыкі, карыты,



This document has been edited with Infix PDF Editor
- free for non-commercial use.
To remove this notice, visit:
www.iceni.com/unlock.htm

У космас лесу, гарода, саду,
У космас клопату
Пра пагоду, пра ўроду, расаду[10].

Нацыянальны свет, як даводзіць паэт, немагчыма ўявіць без гэтага вясковa-сялянскага побыту, спрадвечнай стыхіі народнага жыцця, еднасці з лесам, полем, садам, прыродай наогул. Зямля бацькоў для яго – гэта духоўна-гістарычная спадчына, вечная і непераходная каштоўнасць быцця. Ушаччына, "спадчыннае возера" Вечалле, матчына хата, народная песня, усё тое, што складае іншыя рэгіянальныя вытокі і традыцыі, становіцца ў Р. Барадуліна сутнасным момантам і грунтам яго паэтычнага мыслення, адпраўным пунктам у стварэнні нацыянальнай мадэлі свету. Ён глыбока шануе народнае слова, духоўную культуру свайго краю, усё спадчыннаматчынае на зямлі. У вершы "На схіле алфавіта" рэгіяналізмы, тапонімы радзімы, назвы свят, знаёмыя з дзяцінства імёны, даўнія забытыя ці напаўзабытыя найменні нібы і складаюць своеасаблівы народны слоўнік, увасквашаюць спрадвечны беларускі дух. Паэт жадае зберагчы моўнаэтнічную, генную памяць народа і добра ўсведамляе, што рэгіянальны свет – гэта таксама часцінка цэласнага ўяўлення пра этнас і беларускі этнакосмас.

Рэгіянальны кампанент адыгрывае прыкметную ролю ў раскрыцці нацыянальнага свету і нацыянальнага быцця і ў творчасці шматлікіх іншых паэтаў Беларусі (Н. Гілевіч, А. Пысін, А. Грачанікаў, Я. Янішчыц, Д. Бічэль-Загнетава, Ю. Свірка, А. Лойка, К. Камейша і інш.).

Нацыянальная карціна свету, вобраз Беларусі – свайго роду мазаічнае палатно, і гэта добра адчуваюць самі паэты, калі гавораць, што беларускі вобраз свету "вельмі розны, нават калейдаскапічны"[11] (Л. Дранько-Майсюк), "гэта, хутчэй, не вобраз, а вобразы", якія "па сутнасці з'яўляюцца адным зборным, шматстайным вобразам"[12] (А. Разанаў). Канцэпцыю нацыянальнага вобраза свету наўрад ці можна лічыць на сённяшні дзень цалкам сфарміраванай, як, несумненна, і тое, што яна будзе пашырацца і дапаўняцца. Відавочна, што дадатковага далейшага вывучэння патрабуе даследаванне ўплыву рэгіянальных фактараў і традыцый на выпрацоўку беларускай мадэлі свету.

[1] Гл.: Гачев Г.Д. Национальные образы мира. М., 1988.
[2] Шамякіна Т.І. Нацыянальны космас беларусаў і літаратура (да пастаноўкі праблемы) // Шляхам стагоддзяў: Матэрыялы дзвюх канф. аднаго года / Пад рэд. А.А. Лойкі. Мн., 1992 С. 78–87.
[3] Гачев Г.Д. Указ. тв.
[4] Гл.: Королев С.И. Вопросы этнопсихологии в работах зарубежных авторов. М., 1970
[5] Бромлей Ю.В. Этнос и этнография. М., 1973. С. 163.
[6] Навуменка І.Я. Янка Купала. 2-е выд., дап. Мн., 1980. С. 113.
[7] Грынчык М.М. Рэгіянальныя традыцыі і творчы працэс // Рэгіянальныя асаблівасці беларускай мовы, літаратуры і фальклору: Тэз. дакл. рэсп. навук. канф. Гомель, 1973. С. 89.
[8] Цытаты з твораў Я. Коласа тут і далей падаюцца паводле выд.: Колас Я. Збор твораў: У 14 т. Мн., 1971–1976. Т. 1.
[9] Баравы Р. Матывы творчасці Максіма Танка // Танк М. На этапах: Вершы. Факсімільнае выд. Вільня, 1936. С. VII.
[10] Барадулін Р. Самота паломніцтва: Кн. паэзіі. Мн., 1990. С. 62.
[11] Анкета "Вобраза": Уладзімір Калеснік, Алесь Разанаў і інш. // Вобраз-90: Літ.-крыт. артыкулы Мн., 1990. С. 14.
[12] Там жа. С. 28.

***Бельскі Алесь Іванавіч*** – доктар філалагічных навук, прафесар кафедры беларускай літаратуры XX ст. БДУ.

*М.І. ЧМАРАВА*

## Я.А. ЛЯЦКІ ЯК ДАСЛЕДЧЫК БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Яўген Аляксандравіч Ляцкі (1868–1942) – гісторык і тэарэтык літаратуры, пісьменнік, першы прафесар рускай мовы і літаратуры Карлавага універсітэта ў Празе, ганаровы доктар Бялградскага універсітэта, член-карэспан-



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm